**Сцэнарый урока**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура», 7 клас**

**Метадычны каментарый**

У рамках рэалізацыі агульнарэспубліканскага праекта «Урок у музеі», які накіраваны на выкарыстанне рэсурсаў музеяў краіны ў патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі, установамі агульнай сярэдняй адукацыі арганізуюцца ўрокі ў музеі на базе музейных экспазіцый.

Для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі прапануецца Пералік тэм для правядзення вучэбных заняткаў у форме экскурсій, якія размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/images/2024/07/urok-v-myzee-perechen.pdf

Наведванне музеяў мае вялікае значэнне для працэсу навучання і выхавання. Музейныя прадметы, выконваючы функцыю наглядных дапаможнікаў, спрыяюць вывучэнню розных фактаў, з'яў, падзей. Візуальнае ўспрыманне інфармацыі, атрыманай у музеі, паляпшае засваенне вучэбнага матэрыялу, фарміруе эмацыянальную памяць.

Правядзенне ўрока ў музеі ўзгадняецца з адпаведным структурным падраздзяленнем музея (дата і час; тэма ўрока, экспазіцыя музея і іншае). Ва ўзаемасувязі з экскурсаводам (супрацоўнікам музея) неабходна вызначыць змястоўныя аспекты ўрока з улікам патрабаванняў вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце, зместу вучэбнага дапаможніка, экспазіцыі музея.

Урокі праводзяць педагагічныя работнікі сумесна з экскурсаводамі (супрацоўнікамі музеяў), каб паўнацэнна прадставіць экспазіцыю і поўнасцю выкарыстаць патэнцыял установы. Пры выкарыстанні вучэбна-метадычнага патэнцыялу музея неабходна ўлічваць, што асноўнай крыніцай новай інфармацыі для вучняў з'яўляецца не толькі аповед спецыяліста, але і сапраўдныя помнікі гісторыі і культуры.

Для аказання метадычнай дапамогі настаўнікам у арганізацыі і правядзенні музейнага ўрока прапануецца прыкладны сцэнарый урока.

**Тэма ўрока:** Якуб Колас «Дзядзька -кухар».
**Тып урока:** камбінаваны.
**Месца правядзення ўрока:** установа «Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа».
**Мэта ўрока:** фарміраванне цікавасці да асобы Якуба Коласа і народных вытокаў яго творчасці;

раскрыццё майстэрства паэта ў абмалёўцы вобраза дзядзькі Антося як носьбіта рыс беларускага нацыянальнага характару;

пашырэнне чытацкага кругагляду і маўленчай культуры вучняў;

устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурнага твора з жывапіснымі творамі, з экспанатамі музея;

выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці, пачуцця годнасці ад усведамлення прыналежнасці да свайго народа, да сваёй нацыі.

**Змест урока:**

| Этап урока | Час | Змест |
|---|---|---|
| Арганізацыйны | 5 хвілін | Настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і мэтай урока.<br>Прадстаўляе супрацоўніка музея, які будзе праводзіць экскурсію.<br>Падкрэслівае значнасць таго, што ўрок будзе праходзіць менавіта ў літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, гістарычным будынку-помніку архітэктуры і гісторыі сярэдзіны XX стагоддзя, дзе захоўваецца памяць пра славутага класіка літаратуры.<br>*Заўвага:*<br>*На вывучэнне ўрыўка «Дзядзька-кухар» адводзіцца 3 урокі. 1-ы ўрок праводзіцца на базе ўстановы «Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа». У працэсе работы вучні дзеляцца на 3 групы для выканання заданняў.* |
| Актуалізацыя ведаў | 5 хвілін | Настаўнік прапануе заданні і пытанні на ўзнаўленне ведаў пра асобу пісьменніка і яго творы, з якімі вучні знаёміліся ў папярэдніх класах:<br>Успомніце, якія вершы, казкі Якуба Коласа вы ўжо чыталі.<br>Якія часткі паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» вам ужо знаёмыя? |
| Асноўны | 30 хвілін | Настаўнік задае вучням пытанне:<br>Што вы ведаеце пра Якуба Коласа і яго сям’ю?<br>Пасля таго, як вучні выкажуцца, слова прадастаўляецца супрацоўніку музея.<br>Супрацоўнік музея знаёміць з экспазіцыйнымі заламі, дзе захаваны прыжыццёвы інтэр’ер пакояў пісьменніка, звяртае ўвагу на ўплыў падзей Вялікай Айчыннай вайны на лёс Якуба Коласа, прапануе да ўвагі віртуальную кнігу «Паэтычная каласіяна», на старонках якой прыжыццёвыя выданні паэта, ілюстрацыі да твораў, урыўкі з пастановак |

| | | |
|---|---|---|
| | | спектакляў і фільмаў, а таксама прадстаўляе мультымедыйны комплекс «Чалавек. Эпоха. Час».<br>Настаўнік акцэнтуе ўвагу вучняў на тым, што ў аснову паэмы «Новая зямля» пісьменнік узяў аўтабіяграфічны матэрыял, успаміны дзяцінства.<br>Супрацоўнік музея расказвае пра ўспаміны сястры Якуба Коласа пра брата і пра дзядзьку Антося.<br>Загадзя падрыхтаваныя вучні выразна чытаюць (па частках) і часткова інсцэніруюць урывак «Дзядзька-кухар».<br>Настаўнік звяртае ўвагу на майстэрства мастака слова ў абмалёўцы характару дзядзькі Антося, выяўленне яго душэўнай дабрыні, чуласці, вынаходлівасці, педагагічнага таленту і прапануе:<br>параўнаць вобразы дзядзькі Антося на рэпрадукцыях карцін Васіля Шаранговіча «Дзядзька-кухар», Лазара Рана «Дзядзька Антось» (у вучэбным дапаможніку) і ва ўрыўку і вызначыць, з дапамогай якіх дэталей мастакі і паэт перадаюць свае адносіны да героя;<br>падабраць са зместу прыклады:<br>дзе дзядзька Антось раскрываецца як тонкі псіхолаг і верны сябар дзяцей (1 група);<br>дзе раскрываецца ўмельства дзядзькі Антося зацікавіць дзяцей прыгажосцю прыроды роднага краю (2 група);<br>дзе раскрываецца дзядзька Антось як «майстар на ўсе рукі» (3 група);<br>вызначыць рысы беларускага нацыянальнага характару ў вобразе дзядзькі Антося (звярнуць увагу, якія вобразна-выяўленчыя сродкі выкарыстаў паэт) |
| Заключны | 5 хвілін | Падчас падвядзення вынікаў урока ў музеі настаўнік прапануе адказаць на пытанні:<br>Якія звесткі пра асобу Якуба Коласа вам найбольш запомніліся?<br>Як характарызуюць дзядзьку Антося яго паводзіны з дзецьмі?<br>Якая роля гумарыстычных апісанняў у раскрыцці характару дзядзькі Антося?<br>Чаму можна навучыцца ў галоўнага героя твора? |

| | | |
|---|---|---|
| | | *Творчае заданне (па жаданні)*. Падрыхтаваць вуснае выказванне «Пасля знаёмства з вобразам дзядзькі Антося я хацеў бы (хацела б) перанесці ў свае ўзаемаадносіны з дарослымі і бацькамі…» |